# § 22. Духоўнае развіццё цывілізацый у Познім сярэднявеччы

СІНТАІЗМ ДЗЕСЯЦІНА
КАТАЛІЦТВА ПРАВАСЛАЎЕ
ІНДУІЗМ БУДЫЗМ
ІСЛАМ УНІВЕРСІТЭТ
ДУХОЎНА-РЫЦАРСКІ ОРДЭН
ІНДУЛЬГЕНЦЫЯ

**1. Роля царквы ў палітычным, эканамічным і культурным жыцці еўрапейскіх дзяржаў.** Духоўнае жыццё грамадства цесна звязанае з вытворчасцю духоўных каштоўнасцей, з унутраным светам чалавека, яго маральнасцю і светапоглядам. У сярэдневяковых цывілізацыях галоўную ролю ў гэтай сферы грамадскага жыцця адыгрывала рэлігія.

### Царква ў Заходняй Еўропе

У Заходняй Еўропе ў перыяд Позняга сярэднявечча каталіцкая царква па-ранейшаму была самай магутнай арганізацыяй. Яна забяспечвала маральнае абгрунтаванне для валадароў, якія імкнуліся заручыцца падтрымкай царквы для ўмацавання сваіх пазіцый. Папа як духоўны лідар меў значны аўтарытэт, мог прызначаць і адхіляць кіраўнікоў дзяржаў, што рабіла яго ключавым палітычным гульцом.

> Успомніце, калі і чаму адбыўся раскол хрысціянскай царквы.

Аднак у XIV ст. уплыў царквы на ўнутраныя справы дзяржаў пачаў зніжацца. Палітычная раздробленасць Заходняй Еўропы саступала месца нацыянальным дзяржавам, цэнтралізаваная ўлада каралёў умацоўвалася. Яскравымі прыкладамі крызісу царквы зрабіліся Вялікі раскол (1378–1417 гг.) і падпарадкаванне духавенства сваім гасударам. У перыяд Вялікага расколу адразу два, а пасля і тры

У сярэдзіне XIV ст. герцаг Аўстрыі заявіў: «У сваіх землях я сам буду Папам». Чаму ў дадзены перыяд свецкія гасудары здолелі ўзяць верх над пáпамі?

прэтэндэнты абвясцілі сябе сапраўднымі пáпамі. Інквізіцыя ў Іспаніі перайшла пад кантроль каралеўскай улады. У Францыі пáпам забаранілі прызначаць біскупаў, а ў Англіі біскупам мог быць толькі англічанін. Свецкая ўлада пап захавалася ў асноўным у Цэнтральнай Італіі. Спробы ўмяшання пап у справы дзяржаў спыняліся каралямі і падтрымліваліся мясцовым духавенствам.

Нягледзячы на аслабленне ўплыву, царква заставалася буйны́м зямельным уласнікам і адыгрывала вялікую ролю ў эканамічным жыцці. Прыкладна трацiна зямлі, што апрацоўвалася ў Заходняй Еўропе, належала цэрквам і манастырам. Царква збірала дзесяціну і прадавала індульгенцыі, а выручаныя сродкі ішлі на фінансаванне разнастайных праектаў, у тым ліку будаўніцтва храмаў. Царква назапашвала багацці і рабілася крэдыторам каралёў. Храмы прываблівалі паломнікаў, што спрыяла гандлю і атрыманню прыбыткаў.

- плата за абрады
- продаж царкоўных пасад
- продаж індульгенцый
- ахвяраванні
- дзесяціна
- паломніцтва

*Даходы царквы*

Царква аказвала значны ўплыў на прававую сістэму і судовыя працэдуры. Інквізіцыя выкарыстоўвалася як інструмент для выяўлення і пакарання ерэтыкоў, а таксама тых, чые перакананні разыходзіліся з вучэннем царквы. Абмежаванне доступу да рэлігійных абрадаў служыла сродкам ціску на манархаў і розныя сацыяльныя групы. Апроч таго, царква актыўна інвеставала ў адукацыю і дабрачыннасць, фінансавала школы, універсітэты і бібліятэкі, што спрыяла распаўсюджванню культуры і фарміраванню інтэлектуальнай эліты.

## Хрысціянская царква ва Усходняй Еўропе

Ва Усходняй Еўропе насельніцтва пераважна вызнавала праваслаўе. Руская праваслаўная царква фарміравала духоўныя каштоўнасці і нормы паводзін, рабілася асновай для фарміравання ідэнтычнасці трох братніх народаў — беларускага, рускага і ўкраінскага.

Амаль да сярэдзіны XV ст. Руская праваслаўная царква не была самастойнай. Яна па-ранейшаму з'яў-

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Ва ўмовах панавання рэлігійнага светапогляду і пануючай ролі царквы ўсякая нязгода з існуючым ладам успрымалася як супрацьстаянне «божаму парадку», ерась (ілжэвучэнне), адыход ад афіцыйнай рэлігіі. У 1982 г. Папа Рымскі Ян Павел II папрасіў прабачэння за «памылкі» інквізіцыі, а ў далейшым некалькі разоў асудзіў яе за «нецярпімасць і нават гвалт у служэнні ісціне».

1. *Каго ў Сярэднія вякі называлі ерэтыкамі? Чаму каталіцкая царква лічыла іх пропаведзі небяспечнымі?*
2. *Як каталіцкая царква змагалася супраць ерэтыкоў? З якой мэтай былі створаны так званыя жабрацкія манаскія ордэны — дамініканцаў і францысканцаў?*
3. *Растлумачце значэнне крылатага выразу «паляваннне на вядзьмарак».*
4. *Якое значэнне ў сучасным свеце мае прызнанне гістарычных памылак?*



„Клір не вучыць, а псуе народ сваёй распустай, звязанай з багаццем. Дык трэба адабраць у яго багацце! Пераемнікі Хрыста павінны быць бедныя, як апосталы. А яны, наадварот, толькі пра тое і дбаюць, як бы яшчэ павялічыць свае багацці, для чаго рассылаюць прадаўцоў індульгенцый і драпежных манахаў, якія... ладзяць нікому не вядомыя святкаванні, выдумляюць цуды і рабуюць бедны народ...“

Ян Гус, чэшскі прапаведнік, мысляр, рэлігійны рэфарматар

За што Ян Гус крытыкаваў каталіцкую царкву?
Як вы лічыце, ці можна лічыць гусіцкі рух першай сур'ёзнай спробай рэфармавання каталіцкай царквы? Свой адказ аргументуйце.

лялася часткай Канстанцінопальскага патрыярхату, бо Візантыйская імперыя да самага свайго падзення (1453 г.) заставалася галоўным цэнтрам праваслаўя ў свеце. Рускія мітрапаліты прызначаліся патрыярхам у Канстанцінопалі і насілі тытул «Кіеўскі і ўсяе Русі». Пасля 1325 г. іх рэзідэнцыя размяшчалася ў Маскве.

## Фларэнтыйская царкоўная унія

**Унія** — аб'яднанне, саюз.

Якія рэлігійныя і палітычныя уніі вам вядомыя?

Важную ролю ў пераадоленні залежнасці ад Канстанцінопаля адыграла ўзмацненне Маскоўскага вялікага княства, якому ўсё больш была патрэбна ідэалагічная падтрымка царквы. Вырашальныя падзеі адбыліся ў перыяд падрыхтоўкі і падпісання Фларэнтыйскай **уніі** (1439 г.), якая мела мэтай аб'яднанне праваслаўнай і каталіцкай цэркваў пад эгідай Рыма: праваслаўныя прызнавалі вяршэнства Папы Рымскага, прымалі каталіцкае веравучэнне, але захоўвалі праваслаўны абрад набажэнства. Каталіцкая царква спадзявалася такім чынам аднавіць і ўмацаваць аўтарытэт папства, у той час як праваслаўныя ўлады Канстанцінопаля шукалі падтрымку Захаду ў супрацьстаянні з туркамі-асманамі.

Акт аб аб'яднанні цэркваў без ваганняў падпісаў мітрапаліт Рускай царквы Ісідар, грэк з паходжання і актыўны прыхільнік уніі. Аднак пасля вяртання ў Маскву і службы ў храме з каталіцкім крыжам ён быў звергнуты паводле загаду вялікага князя маскоўскага Васіля II Цёмнага. Фларэнтыйская унія ў Рускай дзяржаве не была прызнаная ні свецкай, ні рэлігійнай уладай; унію асудзілі як ерась і адступніцтва.



*Кіеўскі мітрапаліт Ісідар перад Папам Рымскім Яўгеніем IV. Мініяцюра. XVI ст.*

Грэк Ісідар быў апошні мітрапаліт у Маскве, якога паставіў канстанцінопальскі патрыярх. У 1448 г. Маскоўскі сабор праваслаўных іерархаў абраў першым рускім мітрапалітам разанскага епіскапа Іону. Руская царква набыла фактычную незалежнасць (аўтакефалію) ад Канстанцінопаля.

## Новы этап у гісторыі праваслаўя

Гэтыя падзеі паклалі пачатак новаму этапу ў гісторыі праваслаўя, калі царква зрабілася не толькі рэлігійным, але і важным палітычным цэнтрам у Рускай дзяржаве. Да ліку святых цяпер прылічваліся ў асноўным царкоўныя дзеячы, а не князі, як гэта было раней. Падтрымкай царквы забяспечвалася ўмацаванне пазіцый Маскоўскага вялікага княства як праваслаўнай дзяржавы. Духавенства актыўна

спрыяла легітымацыі ўлады князёў, а пасля і цароў, сцвярджала боскае паходжанне іх улады.

Руская праваслаўная царква не толькі захоўвала рэлігійныя традыцыі, але і адыгрывала важную ролю ў культурным жыцці грамадства, фінансавала будаўніцтва храмаў, манастыроў і навучальных устаноў. Пад яе апякунствам ствараліся шэдэўры архітэктуры, жывапісу і літаратуры. Царква таксама дапамагала бедным і абяздоленым, праяўляючы сваю сацыяльную адказнасць. Праваслаўе зрабілася неад'емнай часткаю рускай ідэнтычнасці і гісторыі, умацоўваючы сувязь паміж мінулым і цяперашнім.

Як вы разумееце, што такое этнічная ідэнтычнасць? Якія фактары ўплываюць на яе развіццё?

**2. Культура ў другой палове XIII — XV ст.** Культура большасці краін Заходняй Еўропы працягвала кіравацца традыцыямі, закладзенымі ў эпоху росквіту Сярэднявечча. Аднак пачалі праяўляцца і новыя рысы, якія адлюстроўвалі змены ў грамадстве. Універсітэты паступова вызваляліся ад папскага ўплыву. Звужалася сфера прымянення лацінскай мовы. Адной з найважнейшых асаблівасцей культуры таго часу было павелічэнне колькасці твораў, напісаных на нацыянальных мовах.

Новыя рысы ў развіцці культуры і навукі

Развіццё вытворчасці абумовіла рост патрэбы ў адукаваных людзях. У Еўропе былі заснаваныя дзясяткі новых універсітэтаў, кожны з якіх меў сваю прафесійную накіраванасць. Напрыклад, у Салерна (Італія) вывучалі медыцыну, у Балонні (Італія) — права, у Оксфардзе (Англія) найлепш выкладалі матэматыку і астраномію, у Сарбоне (Францыя) рыхтавалі багасловаў.

Спецыялізацыя ўніверсітэтаў

Найбольш шырока развіваліся навукі, звязаныя з практычнымі патрэбамі грамадства: матэматыка, юрыспрудэнцыя, медыцына. Важную ролю ў навуковай культуры Сярэднявечча адыгрывала алхімія. Алхімікі займаліся пераважна пошукамі субстанцыі, якая магла б ператвараць звычайныя металы ў золата або срэбра і служыць сродкам бясконцага прадаўжэння чалавечага жыцця. Хоць мэты і сродкі, што

Асаблівая цікавасць да алхіміі

Растлумачце, чаму менавіта ў Сярэднія вякі мелі пашырэнне астралогія і алхімія.

выкарыстоўваліся, былі вельмі сумнеўныя і часцей за ўсё ілюзорныя, алхімія ўсё бліжэй звязвала свае вопыты з паўсядзённымі патрэбамі, у прыватнасці з медыцынай (стварэнне лекаў з неарганічных злучэнняў лекарам Парацэльсам у XV ст.). Былі распрацаваныя новыя метады правядзення вопытаў, удасканалена апаратура (перагонны куб, хімічныя печы), адкрыты шляхі атрымання новых хімічных злучэнняў.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



*Упраўленне вывіхнутага пляча. Мініяцюра. XV ст.*

У Сярэднія вякі людзей вышэйшых саслоўяў лячылі ўрачы, якія мелі медыцынскую адукацыю, атрыманую ва ўніверсітэтах. Простых гараджан лячылі цырульнікі.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, хто такія былі сярэдневяковыя цырульнікі. Якія медыцынскія працэдуры яны выконвалі? Як ажыццяўлялася падрыхтоўка такіх спецыялістаў у сярэдневяковай Еўропе?*
2. *Калі з'явіліся першыя бальніцы?*
3. *Што прыводзіла да распаўсюджання эпідэмій інфекцыйных захворванняў у сярэдневяковай Еўропе? Што маглі прапанаваць урачы для лячэння хваробы, з якой яны раней не сутыкаліся?*
4. *У чым заключаўся станоўчы і адмоўны ўплыў каталіцкай царквы на развіццё медыцыны ў Заходняй Еўропе ў перыяд Сярэднявечча?*

### Тэхнічныя вынаходствы і адкрыцці

У XIV–XV стст. з'яўляюцца шматлікія апісанні розных зямель, удасканальваюцца карты, складаюцца геаграфічныя атласы. Выхады у адкрытае мора сталі больш бяспечнымі пасля таго, як у маракоў з'явіліся компас і астралябія для вызначэння месца, дзе знаходзіцца карабель. У XV ст. стварылі спрытны лёгкі парусні — каравелу. Такія караблі былі рухомыя і ёмістыя, на іх можна было выпраўляцца ў далёкія марскія падарожжы.

Пашырэнне пісьменнасці павялічыла попыт на кнігі. Пры ўніверсітэтах ствараліся вялікія бібліятэкі.

Так, бібліятэка Сарбоны ў сярэдзіне XIV ст. налічвала амаль 2000 тамоў. Для забеспячэння ўзрослай патрэбы ў кнігах у гарадах з'явіліся майстэрні, якія бралі заказы на перапісванне кніг. У Еўропе атрымаў пашырэнне выраб паперы, але кніг па-ранейшаму не хапала. У сярэдзіне XV ст. нямецкі вынаходнік Іаган Гутэнберг стварыў кнігадрукавальны станок, дзякуючы чаму з'явілася магчымасць выпускаць танныя і зручныя кнігі. Гэта, у сваю чаргу, паспрыяла хуткаму абмену інфармацыяй і пашырэнню адукацыі.

У гэты перыяд пачалі выкарыстоўваць вадзяны рухавік. У папяровай вытворчасці ён ужываўся для пад'ёму і апускання прэсаў, а ў горназдабыўной галіне — для перамяшчэння і здрабнення руды, а таксама адпампоўкі вады з шахтаў, што дазволіла рабіць іх глыбейшымі. Істотныя змены адбыліся ў плаўцы і апрацоўцы металаў. У XIV ст. пачалі будаваць домны — вялікія плавільныя печы, якія дасягалі 3–4 м у вышыню. Спускавы механізм з зубчастым колам дазволіў стварыць цалкам механічны гадзіннік.

Якія тэхнічныя ўдасканаленні былі неабходныя Іагану Гутэнбергу для таго, каб надрукаваць кнігу?

## ТЭХНІЧНЫЯ АДКРЫЦЦІ І ВЫНАХОДСТВЫ




Як гэтыя дасягненні ўплывалі на развіццё сярэдневяковага грамадства? Якое з тэхнічных вынаходстваў вы лічыце найбольш значным? Абгрунтуйце свой выбар.

*Царква зрабілася падмуркам адукацыі і культурных каштоўнасцей, адыгрывала важную ролю ў этнічнай кансалідацыі народаў. Аднак, з іншага боку, яна выклікала незадавальненне насельніцтва. Гандаль індульгенцыямі меў вынікам абвінавачванні царквы ў карупцыі. Культура Заходняй Еўропы захоўвала сярэдневяковыя традыцыі, але ў ходзе далейшага развіцця адбываецца аслабленне ўплыву царквы на духоўнае жыццё грамадства.*

**калі ў свеце…**

XIV–XV стст. — паступовае аслабленне ўплыву царквы на духоўнае жыццё грамадства

**на тэрыторыі Беларусі…**

XIV–XV стст. — перыяд мірнага суіснавання на тэрыторыі ВКЛ прадстаўнікоў розных канфесій

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Якія змены ў рэлігійным жыцці Заходняй Еўропы адбыліся ў XIV–XV стст.? Чым яны былі абумоўлены?
2. Ахарактарызуйце становішча праваслаўнай царквы ва Усходняй Еўропе ў XIV–XV стст.
3. Назавіце пяць ключавых характарыстык еўрапейскай культуры Позняга сярэднявечча, якія адрознівалі яе ад папярэдніх эпох.
4. Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце постар «Культура і рэлігіі ўсходніх цывілізацый у перыяд Позняга сярэднявечча».
5. Вызначце асноўныя гістарычныя падзеі Позняга сярэднявечча, якія, на вашу думку, паўплывалі на духоўнае развіццё грамадства. Свой выбар аргументуйце.